■ К@нтыненты

ВЯРТАННЕ ПАЎВОСТРАВА

Калі аб'яднаюцца Паўночная і Паўднёвая Карэі?

Сёння КНДР перайшла на адзіны з Паўднёвай Карэяй час. Стрэлкі гадзіннікаў тут перавялі на 30 хвілін наперад. Такое рашэнне днямі прыняў прэзідыум Вярхоўнага народнага сходу краіны. Як вядома, розніца ў часе паміж краінамі ўзнікла 15 жніўня 2015 года, калі КНДР перавяла стрэлкі на паўгадзіны назад з нагоды гадавіны вызвалення Карэі. Таксама стала вядома, што дзяржавы паўвострава дэмантуюць устаноўленыя на мяжы гучнагаварыцелі для вядзення «псіхалагічнай вайны». Пра гэта гаворыцца ў паведамленні Мінабароны Паўднёвай Карэі. З іх дапамогай гэтая краіна транслявала навіны, песні папулярных карэйскіх выканаўцаў і крытыкавала рэжым КНДР. Паўночная Карэя, у сваю чаргу, крытыкавала ўрад у Сеуле і прапагандавала сацыялістычную сістэму. Гэта першыя крокі па рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на саміце, за ходам якога без перабольшання сачыў увесь свет, яго ўжо ахрысцілі гістарычным. Што прынясе Карэйскаму паўвостраву «новая эпоха міру»?

Сасна міру

Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў — паўднёвакарэйскага прэзідэнта Мун Чжэ Іна і яго паўночнакарэйскага калегі Кім Чэн Ына — прайшла ў памежным населеным пункце Пханмунджом, размешчаным на паўднёвакарэйскай тэрыторыі. Аглядальнікі адзначылі, што абодва лідары трымаліся падкрэслена добразычліва. Яны паціснулі адзін аднаму рукі над раздзяляльнай паласой, якая ў гэтым месцы афармлена ў выглядзе паўметровага бетоннага парапета, і Кім Чэн Ын пераступіў цераз яе, стаўшы, такім чынам, першым паўночнакарэйскім лідарам, які ступіў на зямлю Рэспублікі Карэя. Поціск рукі палітыкаў пры гэтым, як падлічылі журналісты, доўжыўся 30 секунд. Кім Чэн Ын прапанаваў калегу перайсці на паўночнакарэйскі бок мяжы і таксама зрабіць некалькі здымкаў. Дагэтуль падобныя сустрэчы на вышэйшым узроўні праводзіліся толькі двойчы, у 2000-м і 2007 гадах. Тады з паўднёвакарэйскімі лідарамі сустракаўся Кім Чэн Ір — бацька Кім Чэн Ына. Папярэднія саміты праходзілі ў Пхеньяне.

Перамовы ў Пханмунджоме былі напоўнены сімвалічнымі жэстамі. Так, лідары дзвюх Карэй пасадзілі на дэмаркацыйнай лініі сасну, якая ўвасабляе імкненне дзвюх дзяржаў «да міру і росквіту». Пры пасадцы «дрэва міру» Кім і Мун выкарыстоўвалі глебу з гары Халасан у Паўднёвай Карэі і вулкана Пэктусан у Паўночнай Карэі. Раздзяляльную паласу кіраўнікі дзвюх краін перасягнулі, трымаючыся за рукі. Прайшоўшы ў будынак, які носіць сімвалічную назву — Дом міру, Мун Чжэ Ін заклікаў паўночнакарэйскага прэзідэнта разам несці «мір і росквіт» народам дзвюх краін. Таксама ён адзначыў, што дэмаркацыйная лінія з гэтага моманту стала не сімвалам разладу, а сімвалам міру. Кім Чэн Ын у сваю чаргу заявіў, што прыехаў на саміт з «адчуваннем пачатку новага гістарычнага этапу ў адносінах дзвюх краін». Праз некалькі гадзін стала вядома, што лідары дзяржаў не падманулі чаканняў журналістаў і грамадскасці. Па выніках перамоў было дасягнута пагадненне, якое абяцае стаць паваротным пунктам у гісторыі падзеленага паўвострава.

Ракетны жарт

Карэйскія лідары пацвердзілі, што агульнай мэтай дзвюх краін з'яўляецца правядзенне працэсу дэнуклеарызацыі на Карэйскім паўвостраве, як адзначаецца ў «Пханмунджомскай дэкларацыі аб міры, росквіце і аб'яднанні Карэйскага паўвострава». Гэта азначае, што ўлады КНДР далі прынцыповую згоду на ліквідацыю ядзернай зброі. Аглядальнікі адзначылі, што ў пачатку перамоў Кім Чэн Ын быў прыкметна напружаны і нават дазволіў сабе «ракетны жарт»: паабяцаў Мун Чжэ Іну, што прасочыць за тым, каб ракетныя выпрабаванні не праводзіліся раніцамі і не перашкаджалі спаць суседзям на поўдні.

«На Карэйскім паўвостраве больш ніколі не будзе вайны, пачалася новая эпоха міру», — адзначаецца ў тэксце дэкларацыі. У дакуменце таксама падкрэсліваецца, што дзве дзяржавы «працягнуць актыўны дыялог на ўсіх узроўнях, уключаючы вышэйшы». Акрамя таго, бакі дамовіліся стварыць зону бяспекі ў Жоўтым моры.

Лідар КНДР Кім Чэн Ын падчас сустрэчы з прэзідэнтам Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Інам заявіў, што ў выпадку падпісання пагаднення з ЗША аб заканчэнні вайны ў ядзерным узбраенні не будзе неабходнасці. Яго словы прывёў прэс-сакратар Муна Юн Ён Чхан падчас прэс-канферэнцыі па выніках перамоў, перадае РІА Навіны. «Калі нашы сустрэчы з ЗША будуць частымі, і ў будучыні будзе пабудаваны давер і дасягнута пагадненне аб недатыкальнасці і аб заканчэнні вайны, навошта ж мець ядзернае ўзбраенне і жыць у цяжкіх умовах?», — працытаваў Юн Ён Чхан заяву Кім Чэн Ына. Кіраўнік Паўночнай Карэі таксама адзначыў, што, «нягледзячы на тое што ён заўсёды выступаў супраць ЗША, людзі зразумеюць, што ён не з'яўляецца тым, хто скінуў бы ядзерную зброю на ЗША, Паўднёвую Карэю ці краіны Ціхаакіянскага рэгіёна».

Паўночная Карэя паабяцала дэмантаваць ядзерны палігон. Працэс дэмантажу пачнецца ў маі і будзе публічным — на палігон запросяць экспертаў па бяспецы і журналістаў. «Некаторыя кажуць, што абсталяванне на палігоне не працуе, але вы ўбачыце, што яно ў добрым стане», — заявіў Кім.

Мадэль Кіма

Сярод матываў дзеянняў паўночнакарэйскага лідара эксперты называюць неабходнасць дамагчыся змякчэння санкцый дзеля актывізацыі эканамічнага развіцця краіны. Заявы Пхеньяна аб ядзерным раззбраенні — гэта такі меседж для ЗША, заўважыў gazeta.ru колішні пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Карэя Глеб Івашанцаў. «Кім Чэн Ын зразумеў, што стварыў той патэнцыял, які можа стрымаць ЗША. І таму ён вырашыў, што цяпер ядзерныя выпрабаванні можна прыпыніць і пераключыць сродкі на развіццё эканомікі», — адзначыў дыпламат.

Як вядома, пасля прыходу да ўлады пяць гадоў таму лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын адкрыта паставіў эканамічны рост у шэраг прыярытэтаў — нароўні з распрацоўкай ядзернай зброі. Вынікам сталі паступовыя рынкавыя рэформы, якія прывялі да хуткага росту прыватных прадпрыемстваў і ўзроўню жыцця, адзначаюць эксперты. Фактычна лідар Паўночнай Карэі выбраў мадэль, якой у апошнія дзесяцігоддзі прытрымліваліся Кітай і В'етнам. Яны імкнуліся да эканамічнага росту з дапамогай рынкавых рэформаў, але захоўвалі жорсткі палітычны кантроль. Кім Чэн Ын таксама правёў шырокія рэформы ў сельскагаспадарчай і прамысловай галінах, надаўшы аб'ектам гаспадарання больш самастойнасці. «Самы галоўны міф аб Паўночнай Карэі — гэта тое, што там усім кіруе дзяржава, — кажа Андрэй Абрахамян з кампаніі Choson Exchange, якая падтрымлівае паўночнакарэйскіх прадпрымальнікаў, — Вобраз Кіма асацыюецца з эканомікай, і гэта ўвязваецца з павышэннем якасці жыцця і спажывецкіх тавараў».

Генеральная рэпетыцыя

Абедзве Карэі захаваюць сваю незалежнасць, але пяройдуць ад палітыкі канфрантацыі да супрацоўніцтва. У перспектыве краіны таксама маюць намер падпісаць мірны дагавор. Як вядома, Карэйская вайна 1950—1953 гадоў, у якой з аднаго боку ўдзельнічалі Паўднёвая Карэя і ЗША, а з другога — КНДР і Кітай, завяршылася падпісаннем перамір'я. Тэхнічна Поўнач і Поўдзень дагэтуль знаходзяцца адно з адным у стане вайны.

Кім Чэн Ын, выступаючы ў Пханмунджоме, адзначыў, што ў будучыні Паўночная і Паўднёвая Карэя павінны зноў стаць адзінай дзяржавай. Зараз, лічаць аналітыкі, ёсць усе перадумовы таго, што гэта эпахальная для Карэйскага паўвострава падзея ўсё ж адбудзецца. Як расказала ў інтэрв'ю RT дацэнт Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Ірына Ланцова, і на Поўдні, і на Поўначы даўно распрацоўваюцца формулы аб'яднання паўвострава. «Ёсць дзве асноўныя канцэпцыі. Першая мае на ўвазе паглынанне адной краіны іншай у выніку пэўных узрушэнняў. Другая мадэль, якая існуе і на Поўначы, і на Поўдні, мае на ўвазе паэтапную канфедэрацыю. Відавочна, што гэта вельмі доўгі працэс, магчымы толькі пры рэалізацыі сумесных эканамічных праектаў. Аднак ва ўмовах санкцый рэалізаваць гэтыя праекты немагчыма, таму першачарговая задача звязана з паступовым зняццем санкцый з КНДР. Але тут усё залежыць ад ЗША, — падкрэсліла Ірына Ланцова. — На ўзроўні афіцыйнага дакумента гэтае палажэнне зафіксавана. У той частцы дэкларацыі, дзе гаворка ідзе пра перамовы па ўсталяванні міру на Карэйскім паўвостраве, гаворыцца пра неабходнасць правядзення трохбаковых і чатырохбаковых сустрэч. У першым выпадку маецца на ўвазе фармат «дзве Карэі плюс ЗША», у другім — той жа склад плюс Кітай. Гэта ўжо крок наперад».

Ці будуць увасоблены на практыцы заяўленыя карэйскімі лідарамі планы, стане ясна на працягу найбліжэйшых месяцаў, лічаць эксперты. Вельмі вялікую ролю адыгрывае асобасны фактар: КНДР прадстаўляе малады і амбіцыйны лідар, які разумее, што краіне патрэбны перамены, а ў Паўднёвай Карэі да ўлады летась прыйшоў палітык левалібералнага кшталту, таксама нацэлены на дыялог. Дарэчы, для паўночнакарэйскага лідара саміт у Пханмунджоме стаў «генеральнай рэпетыцыяй» перад сустрэчай з Дональдам Трампам. Калі яна адбудзецца (сустрэчу мяркуецца правесці ў маі ў тым жа Пханмунджоме), Кім Чэн Ын стане першым лідарам КНДР, які сустрэнецца з дзеючым прэзідэнтам ЗША. Да гэтага магчымасць правядзення падобнага саміту абмяркоўвалася яшчэ ў гады прэзідэнцтва Біла Клінтана ў канцы 1990-х, аднак тады сустрэча так і не адбылася. Пры Джорджу Бушу адносіны з КНДР былі жорстка замарожаныя. Дарэчы, у 2009 годзе Клінтан — на той момант ужо былы прэзідэнт — усё ж такі даехаў да Пхеньяна, каб дамагчыся вызвалення двух амерыканскіх журналістаў.

Захар БУРАК

■ «Еўрабачанне-2018»

ГЭЙ, ТАМ, НА БОРЦЕ!

Адметная дзясятка ўдзельнікаў сёлетняга песеннага шоу

Ужо заўтра міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне» афіцыйна адкрыецца ў Лісабоне. Усе 43 яго ўдзельнікі ўжо прыбылі, агледзелі горад, апрабавалі сцэну падчас рэпетыцый і далі першыя прэс-канферэнцыі. А ў аўторак, 8 мая, вызначыцца першая дзясятка шчасліўцаў, якія трапяць у фінальны канцэрт. Супервайзеры абяцаюць як заўжды відовішчнае і высокатэхналагічнае шоу, поўнае сюрпрызаў для публікі. Напярэдадні «Звязда» склала спіс з 10 яркіх, правакацыйных і цікавых канкурсантаў, якіх мы ўбачым і пачуем на 63-м конкурсе.



У нумары ALEKSEEV'а хлопец спявае, дзяўчына танцуе, а ружа страляе.

Рамэа і ружа

Свая кашуля да цела бліжэй, таму пачнём з выканаўцы, які сёлета прадстаўляе Беларусь — 24-гадовы ўкраінскі спявак ALEKSEEV. Прадзюсар артыста Алег Баднарчук, вядомы сваімі маштабнымі пастаноўкамі ўкраінскіх і расійскіх поп-артыстаў, прыдумаў зусім іншую канцэпцыю прадстаўлення песні «Forever», чым мы бачылі ў нацыянальным адборы.

Цяпер няма ніякіх святлодыёдаў, затое ёсць люстэркі і рухомая платформа. Пастаноўка зроблена ў белачырвоных колерах, а адным з галоўных элементаў яе стала ружа — напачатку кветка нібыта лунае ў паветры, а напрыканцы «страляе» і раніць шыпамі спіну выканаўцы. Мікіту Аляксееву ў нумары асісціруе дзяўчына з дзіўным танцам у стылі кантэмп. «Забаўна і нечакана», — так найчасцей ацэньваюць гэта выступленне фанаты конкурсу, блогеры і замежныя журналісты. Зрэшты, на прагнозы букмекераў эфектнасць нумара паўплывала мала: пасля першых рэпетыцый яны прадракаюць ALEKSEEV'у толькі 20-е месца сярод 43 удзельнікаў.

Тут вам не цацкі

Нумарам адзін у спісе фаварытаў па-ранейшаму ідзе ізраільская спявачка Netta з песняй «Тоу» («Цацка»). 25-гадовая Нета Барзілай — яскравы прыклад таго, як працуе формула «талент плюс упартасць». Атрымаўшы ў дзяцінстве грунтоўную музычную адукацыю, пасля службы ў арміі (між іншым, у войсках ВМФ) Нета зноў вярнулася да свайго захаплення музыкай, заснавала гурт імправізацыйных спеваў, актыўна гастралявала па краіне і за яе межамі і праводзіла семінары для маладых музыкаў. Адметнай фішкай Неты стала выкарыстанне вакальнага лупера — спецыяльнай прылады, якая дазваляе выкарыстоўваць шматлікія галасавыя эфекты (дубліраванне, накладанне, закальцоўванне і г. д.)

Сёлета неардынарная спявачка выйграла рэаліці-шоу «Наступная зорка» і атрымала права прадстаўляць краіну на «Еўрабачанні». А песня яе, якая набрала на YouTube ўжо амаль 18 мільёнаў праглядаў і стала вірусным хітом, нясе насамрэч сур'ёзны пасыл — яна звязаная з рухам супраць сексуальных дамаганняў. Нават «квахтанне» на пачатку песні, гаворыць Нета, мае свой сэнс — яно «парадзіруе голас баязліўца і крывадушніка, які абыходзіцца з вамі як з цацкай».

Двойчы ў адну раку

Нарвежац з беларускімі каранямі Аляксандр Рыбак, які ў 2009-м феерычна выйграў конкурс з максімальнымі на той момант баламі за ўсю гісторыю, вернецца сёлета. І зноў пад нарвежскім сцягам. У звыклым вобразе — на першы погляд крыху нязграбны, але надзвычай абаяльны і дружалюбны скрыпач, спявак, а на гэты раз яшчэ і танцор. Дарэчы, у конкурсным нумары скрыпка, як і іншыя інструменты, будзе ўяўнай, намаляванай з дапамогай спецэфектаў. Букмекеры лічаць, што ў цэлым гэта заяўка як мінімум на другое месца, а то і перамогу ў конкурсе.

Кампазіцыя «That's How You Write A Song» («Вось як трэба пісаць песню») — своеасаблівая падказка таленавітым людзям, як важна верыць у сябе, не баяцца занатоўваць свае ідэі і крок за крокам рэалізоўваць іх. Калі ласка, перадайце хто-небудзь гэты рэцэпт нашым беларускім артыстам, якім год ад году нешта перашкаджае «парваць» залу.

Эпатажная ізраільцянка Нета з цацкамі-коцікамі.

Вярблюда выклікалі?

Адным з самых эпатажных удзельнікаў называюць прадстаўніка Чэхіі, мультыінструменталіста Ёзэфа Мікаласа, які плануе выступіць на конкурснай сцэне... з вярблюдам. Праўда, не жывым (гэта забаронена правіламі шоу), а 3D-карцінкай.

Уласна, вярблюд у нумары — гэта толькі сімвал, але сімвалізуе ён чамусьці не вынослівасць або, скажам, наплявальніцкае стаўленне да ўдараў лёсу, а толькі немудрагелістасць песні. Аднак, паводле прагнозаў букмекераў, Чэхія з песняй «Lie to Me» («Схлусі мне») мае ўсе шанцы ўвайсці ў топ-10 лідараў конкурсу.

Усюдыісны Кіркораў

Кароль расійскай поп-сцэны не раз заяўляў, што хворы на «Еўрабачанне» даўно і надоўга, і шмат гадоў удзельнічаў у конкурсе то як кампазітар, то як прадзюсар артыстаў з розных постсавецкіх краін. Не стане выключэннем і бягучы год — сёлета Філіп Бядросавіч напісаў песню для малдаўскага трыа DoReDos і падтрымлівае сваіх падапечных на ўсіх этапах, уключаючы рэпетыцыі ў Лісабоне.

У кліпе Чэхіі здымаўся жывы вярблюд, а на сцэну плануецца вывесці 3D-праекцыю.

Артысты выступяць ва ўборах колераў нацыянальнага сцяга. Усе яны «жывуць» на сцэне ў адмысловым белым доме, паказваючы ў яго вокнах і дзвярах розныя забаўныя позы. Нумар, заўважым, ставіў Фокас Евангелінас — чалавек, які з'еў не аднаго сабаку на еўравізійных пастаноўках для Сяргея Лазарава, Ані Лорак, Дзмітрыя Калдуна, Хелены Папарызу, Дзімы Білана і іншых.

Робаты атакуюць!

Прадстаўніцы Сан-Марына, падобна, «троляць» сваю ізраільскую канкурэнтку: каманда прывезла на «Еўрабачанне» робатаў з патэтычнымі плакатамі «Я не твой робат!» і «Ты выйдзеш за мяне замуж?» Цалкам магчыма, што ў канчатковай версіі сцэнічнага нумара робат нават прапануе заручальны пярсцёнак камусьці з выканаўцаў.

Пасыл песні ў іх таксама падобны — пра тое, што тэрба цаніць і шанаваць унікальнасць кожнага чалавека і нельга здзекавацца з таго, хто чымсьці адрозніваецца ад іншых. «Мы такія, якімі хочам быць, і будзем падымацца кожны раз, калі ўпадзём», — спяваюць Джэсіка і Джэніфер, поўныя рашучасці падтрымаць падлеткаў і дарослых, хто так ці інакш зведаў цкаванне навакольных.

Цікава, хто ў камандзе Сан-Марына дыктуе правілы: дзяўчаты ці робаты?

Мінус тры

Грузінскаму этна-джазаваму калектыву IRIAO дзеля «Еўрабачання» давялося ахвяраваць некалькімі музыкантамі: паводле правілаў конкурсу, на сцэне могуць знаходзіцца толькі шэсць чалавек, а ў гурце іх васьмёра. Аднак канфлікту не здарылася: артысты самі вызначылі, што выступяць у складзе трох вакалістаў, басіста і барабаншчыка.

Песня гурта — «пра той момант, калі вы забываецеся на ўласныя клопаты і працягваеце руку дапамогі іншым, атрымліваючы ў адказ цёплыя эмоцыі». Нумара ў Грузіі як такога няма, але вакальна выступленне бездакорнае, адметнае «фірменным» мужчынскім шматгалоссем.

Вікінг з вялікім сэрцам

Прадстаўнік Даніі Ёнас Расмусен знешне — сапраўдны суровы вікінг, руды і зарослы барадой па вушы. Дэкарацыі для конкурснага нумара ў яго адпаведныя: цемра, парусінкі, завіруха... А вось песня, напісаная шведскімі аўтарамі, — наадварот, пра пошук мірных рашэнняў ва ўсіх канфліктах.

Заснаваная яна, дарэчы, на гістарычным факце: у 1098 годзе вікінг Магнус Эрлендсан адмовіўся біцца з непрыяцелем і сам не абараняўся, але прытым застаўся на сваім караблі, праяўляючы храбрасць, і спяваў царкоўныя псалмы. Не дзіва, што пазней ён быў кананізаваны і ў Скандынавіі ўзнік культ святога Магнуса.

Украінец Melovin устае з раяля, як персанаж кінастрашылак.

Раяль з начынкай

На 63-м песенным конкурсе будзе некалькі раяляў. Адзін з іх — у нумары Украіны — выкарыстоўваецца як... упакоўка з паўпразрыстай накрыўкай для спевака Melovin. Больш песімістычныя крытыкі папросту зазначаюць, што артыст ляжыць у раялі, нібы ў труне.

Зрэшты, змрочная яго песня якраз пра страхі і забабоны. Страшнаватай містыкі дадаюць і вобраз артыста з рознакаляровымі лінзамі ў вачах, і палаючыя прыступкі на сцэне, так што ў гэтым сэнсе ўсё арганічна. А вось наколькі вынікова і эфектна атрымаецца — пакажа паўфінальнае выступленне.

Жанчына, якая спявае

Вельмі чакаюць фаны «Еўрабачання» і выступлення расіянкі Юліі Самойлавай — летась краіна прапусціла конкурс, бо спявачцы забаранілі ўезд на тэрыторыю Украіны, таму вяртанне мусіць быць як мінімум гучным. І ў любым выпадку заўважным: Юлія — адзіная з удзельнікаў гэтага года, хто мае абмежаваныя магчымасці і перасоўваецца на інваліднай калясцы. Аднак яна ўсяляк падкрэслівае, што не прымае шкадавання, бо з'яўляецца моцным чалавекам і не збіраецца ціснуць на кнопкі жалю і спагады гледачоў. Уласна, аб гэтым гаворыць і песня 28-гадовай артысткі — «I Won't Break» («Я не зламаюся»). Праўда, букмекеры на дадзены момант прагназуюць Юліі толькі 20—25 месца.

...Зразумела, яркіх і эфектных нумароў на «Еўрабачанні-2018» будзе нашмат больш — для кагосьці, можа, і ўсе 43. Таму не будзем спрачацца пра густы — уключайце тэлевізары ўвечары 8, 10 і 12 мая, слухайце і падтрымлівайце тое, што вам сапраўды даспадобы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота eurovision.tv